**Епіскап ВЕНЬЯМІН:**

# «УДЗЯЧНЫ ЗА МАГЧЫМАСЦЬ СЛУЖЫЦЬ ЛЮДЗЯМ І БОГУ»

**Чытачы «Звязды» вось ужо больш за дваццаць гадоў сочаць за міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыяй «Дарога да святыняў». Ужо два гады яе акармляе епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, які напярэдадні Новага года стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне». За час служэння Беларускай Праваслаўнай Царкве ўладыка паспеў прайсці шлях ад паслушніка да епіскапа, узначаліць Выдавецкую раду БПЦ, затым — сінадальны аддзел рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі, стаць кіраўніком наваствoранай Барысаўскай епархіі. Вядома, пра добрыя справы не расказваюць. Хутчэй, моўчкі збіраюць іх плады. Але спецыяльна для «Звязды» епіскап Веньямін паразважаў, ці здольны матэматык верыць у Бога, а адно слова — змяніць чалавечы лёс, і паспрабаваў адказаць на пытанне, чаму яму выпала атрымаць такую высокую ўзнагароду.**



***— У свой час вы атрымалі тэхнічную адукацыю і адпаведную спецыяльнасць. І ўжо праз некалькі месяцаў паступілі ў семінарыю. Так хутка прыйшлі да веры ці гэта быў лагічны крок па дарозе да яе?***

— Шлях да веры ў кожнага чалавека непаўторны. Калі чалавек жадае жыць па запаведзях Божых і наследаваць жыццё вечнае, ці можа перашкаджаць у гэтым прафесія? Таму няма нічога дзіўнага, калі людзі з тэхнічнай адукацыяй і нават навукоўцы вераць у Бога і шмат часу аддаюць духоўным пытанням. Шмат хто з вялікіх вучоных — Эйнштэйн, Планк, Ньютан, Мендзялееў — былі глыбока веруючымі. Адно аднаму не перашкаджае. Хаця, безумоўна, па-рознаму можна выкарыстоўваць прызванне Божае ў сваім жыцці.

Асновы веры былі закладзены ў мяне яшчэ ў дзяцінстве. Бабуля была вельмі набожная. Непісьменная, але шчырая верніца. Яна страціла мужа, які загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Адна выхоўвала дзяцей. І, нягледзячы на цяжкасці і смутак пасляваеннага часу, дзякуючы сваёй веры яна выжыла, выгадавала дзяцей і стала для мяне прыкладам чалавека ціхмянага, цярплівага, шчодрага, які глыбока верыць. Яе паважалі ўсе аднавяскоўцы. Яе вобраз, нашы сумесныя гутаркі адклалі пэўны адбітак. Пасля, калі ўжо вучыўся ў школе, ва ўніверсітэце, шмат што было забыта. Але калі храмы пачалі зноў адкрывацца, адраджалася царкоўнае жыццё на Беларусі, таксама стаў цікавіцца праваслаўем і згадаў тыя веды, што ў дзяцінстве атрымаў ад бабулі.

***— Пасля прынялі манаства і паступова дайшлі да епіскапскага сану. У вас столькі паслухаў зараз! Адкрыйце, калі ласка, сакрэт: як усё паспяваеце?***

— За ўсе гэтыя гады паслухаў сапраўды было шмат, але з таго часу, як стаў кіраваць Барысаўскай епархіяй, іх стала меней. На жаль, нельга адразу ўсё сумяшчаць. Вядома, усё паспяваць складана, таму даводзіцца прасіць дапамогі ў Бога. Яго спагадай атрымліваецца штосьці рабіць. Вядома ж, і сіламі добрых, надзейных памочнікаў. Шмат добрых спраў адбываецца менавіта дзякуючы ім.

***— Вы таксама часта наведваеце дзіцячыя дамы і інтэрнаты, хворых дзетак. Як вы лічыце, што для іх больш важна ў размове, у адносінах з валанцёрамі ці гасцямі: духоўнае ці матэрыяльнае?***

— Зараз дзіцячыя дамы наведваю як кіруючы архірэй — па абавязках. Але, па шчырасці, адчуваю неабходнасць хрысціяніна дапамагаць тым, хто мае патрэбу. У такога кшталту ўстановах усё з неабходнага ёсць, але душа ў выхаванцаў шукае чагосьці большага: сардэчнай прыхільнасці, шчырай размовы, любові, падтрымкі, спачування. Не заўжды гэта павінна быць шкадаванне, якое часам можа і пакрыўдзіць дзяцей. І па прыродзе сваёй душы ім уласціва цягнуцца да духоўнага. Але калі духоўныя патрэбы не знаходзяць патолі, тады чалавек задавольваецца душэўнымі радасцямі. Калі не мае і іх, то звяртаецца да матэрыяльных.

***— Ці можна за кароткае наведванне паспець даць дзіцяці крыху любові?***

— Безумоўна. Зразумела, што лепей, калі дзіцячыя дамы наведваюцца духоўнымі асобамі з пэўнай перыядычнасцю: раз на тыдзень ці на месяц. Лепей першае. Каб усё ж такі тое духоўнае, што закладваецца на працягу кароткай размовы, захавалася да наступнай сустрэчы і паступова назапашвалася.

Часам так выходзіць, што дарослыя зрабілі ўсё, каб дзяцей парадаваць, вывесці з задумення, але на іх тварах усё адно застаецца знак суму. Тое, наколькі нашы дзеі і словы дасягаюць сэрцаў іншых, вельмі індывідуальна для кожнага з выхаванцаў і часта непрадказальна.

***— Ужо каму, калі не вам, яшчэ нядаўна старшыні Выдавецкай рады Царквы, ведаць, ці здольнае слова змяніць лёс чалавека?***

— Слова шмат што можа змяніць у нашым жыцці. Часта людзі раздражнёныя, якія не маюць міру ў душы, пачуюць чалавека, які гаворыць ціха і лагодна, і супакояцца, задумаюцца. Мне не раз даводзілася бачыць такіх асоб. Слова Божае нам паведамляе, што «ад паўнаты сэрца гавораць вусны». Калі чалавек мае паважлівае стаўленне да людзей, душэўную цеплыню, любоў, то сваім словам зможа змякчыць сэрца таго, хто паступае няслушна, і будзе пачутым.

У адным з месцаў зняволення праводзілася апытанне пра тое, якую б кнігу яны хацелі мець у сябе. І амаль усе называлі адну — Біблія. Безумоўна, яна і Новы Запавет дапамагаюць чалавеку зірнуць на гэты свет і сэнс жыцця па-іншаму, натхніцца жыць па-новаму. Безумоўна, існуюць і іншыя кнігі, якія растлумачаць тую ж ісціну. Напрыклад, у творах старца Паісія (Святагорца) простымі, даступнымі кожнаму словамі расказваецца пра дабрачыннасць, страсці, духоўную барацьбу, сямейныя пытанні, малітву. Гэтыя кнігі вылучаюцца прастатой і ў той жа час глыбіннай мудрасцю. Прападобнага Паісія, дарэчы, нядаўна залічылі да ліку святых.

***— Калі азірнуцца на пражытыя гады, на ўсё спасцігнутае і зробленае, ці можаце вы самі сабе даць адказ, за што вас узнагародзілі?***

— Я задаваў сабе такое пытанне. За што? Раблю тое, што павінен, і шмат хто працуе гэтак жа сама ў Царкве на такіх жа пасадах. Апостал Павел кажа, што гора таму, хто не робіць тое, што абавязаны. А калі я атрымліваю за гэта ўзнагароду, то гляджу на яе як на стымул больш працаваць і бачу пэўны дакор у тым, што зроблена яшчэ не ўсё магчымае.

***— Прысуджэнне прэміі — гэта прызнанне ад людзей. А якія ў вас ёсць узнагароды ад Бога?***

— Магчымасць служыць у прастола Божага — ужо вялікі дар. Іаан Златавуст ставіць епіскапскае служэнне святара нават вышэй за царскае. Разам з тым гэта і магчымасць служыць у духоўнай сферы і свайму народу. Духоўнасць шмат у чым вызначае лёс кожнага з нас і ў выніку — будучыню ўсёй краіны. Гэтую адказнасць і ўзнагароду я прымаю са шчырай удзячнасцю.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ПАДЗЯКА І ВЕРА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Кожны з нас, для каго Гасподзь — Айцец Нябесны, абавязкова павінен прынесці да Віфлеемскіх ясляў яшчэ адзін дар — любоў: любоў адзін да аднаго, да ўсіх навакольных людзей — гарачую і дзейсную, бо «па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі любоў будзеце мець паміж сабою» (Ін. 13: 35). Побач з намі заўсёды ёсць тыя, хто пакутуе, падае духам, адчайваецца, старыя і нядужыя, хворыя, гаротныя і самотныя. Неабходна разумець, што там, дзе няма любові, узаемнай падтрымкі і адказнасці, гатоўнасці ўсё жыццё прынесці ў дар тым, каго любіш, там няма ні шчасця, ні радасці, ні паўнаты быцця. Гасподзь і Спасіцель чакае ад верных дзяцей Святой Царквы добрых пладоў — служэння любові і міласэрнасці дзеля нашых бліжніх.

Год мінулы, міласцю Божай, прынёс нам нямала духоўнай радасці. Ён быў адзначаны шматлікімі добрымі здзяйсненнямі ў жыцці нашай Царквы, якія таксама сталі своеасаблівымі падарункамі Богадзіцяці Хрысту.

У дні святкавання Раства Госпада і Спасіцеля нашага Царква Хрыстова заклікае да радаснай і ўдзячнай малітвы, і мы ўзносім хвалу і падзяку ўцялесненаму Сыну Божаму, Які прынёс на зямлю вечнае збаўленне, любоў і мір, за ўсе Яго дабрадзействы і міласці, дараваныя ў мінулым годзе, за Яго ўсемагутную дапамогу, што ўмацоўвала нас у выпрабаваннях, якія мы пераадольвалі з верай і спадзяваннем на Бога.

Любоў і мірнае адзінства прынёс на зямлю Гасподзь наш Ісус Хрыстос: «няхай усе будуць адно: як Ты, Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, так няхай і яны ў Нас будуць адно» (Ін. 17: 21). Найвышэйшая мэта, указаная Спасіцелем, які прыйшоў на зямлю, — мірнае адзінства людзей у адзінстве з Богам, у адной праваслаўнай веры, у Адзінай, Святой, Саборнай і Апостальскай Царкве. Як верныя дзеці Хрыстовы, усе мы павінны клапаціцца пра захаванне адзінства Святой Праваслаўнай Царквы.

Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, выступаючы на XIX Сусветным Рускім народным саборы з дакладам «Спадчына князя Уладзіміра і лёс гістарычнай Русі», адзначыў, што «ў год 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра мы звяртаемся да спадчыны, якую ён нам пакінуў... Спадчына заўсёды змяшчае ў сабе запавет, заахвочвае нашчадкаў да дзеяння. Відавочна, што асноўны і самы каштоўны для нас сэнс спадчыны роўнаапостальнага князя — гэта сэнс рэлігійны: гэта прынятая народам вера Хрыстова». Выбар Хрысціцеля Русі «дазволіў народу раскрыць свае здольнасці і таленты ў лоне хрысціянства, выявіць сябе ў служэнні ўсяленскай ісціне Хрыстовай і ў межах гэтага служэння стварыць уласную цывілізацыю».

Першасвяціцель заклікаў усіх «адчуць і асэнсаваць адзіны гістарычны шлях, які пачаўся з Хрышчэння Русі: ім мы крочылі скрозь усе выпрабаванні да перамог, менавіта гэты шлях адкрывае нам перспектыву будучыні. Гэтая перспектыва — захаванне і будаўніцтва нашай самабытнай цывілізацыі, якая абапіраецца на ўніверсальны хрысціянскі падмурак і ўлічвае нацыянальныя пачаткі народаў. Такі для нас найважнейшы ўрок спадчыны святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Мы павінны быць вартымі гэтай спадчыны, абавязаны захаваць яе і перадаць наступным пакаленням», — падкрэсліў найсвяцейшы Патрыярх Кірыл.

Дарагія і ўзлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, айцы, браты і сёстры! Зноў і зноў віншую вас са светлым і радасным святам Раства Хрыстовага і малітоўна зычу невычэрпнай дабрадатнай дапамогі Божай у вашай працы дзеля славы Беларускай Праваслаўнай Царквы, дзеля славы Бацькаўшчыны нашай — благаславеннай Белай Русі, на радасць усім нашым бліжнім. Амінь.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У БІБЛІЯТЭКАХ КАНІКУЛЫ ВЕСЯЛЕЙШЫЯ

**У дні зімовых канікул наваполацкая бібліятэка імя У. Караткевіча запрасіла наведвальнікаў прыняць удзел у святочных мерапрыемствах. Каб яны надоўга запомніліся, арганізатары пастараліся іх зрабіць вясёлымі, напоўненымі цудамі, гульнямі, конкурсамі.**

— У створаным «чароўным замку» арганізаваны выстава і кінапаказ. Казачныя персанажы ўручаюць першым чытачам сувеніры. Сувеніры зрабілі ў бібліятэчнай «мартышчынай кают-кампаніі» разам з валанцёрамі са школы №12. У гульнятэцы «Чытаем, фантазіруем, гуляем!» Снежная каралева чытае дзецям казкі. Упадабаных падчас праслухоўвання жывёл можна намаляваць на пяску, — паведамілі ў Наваполацкім гарвыканкаме.

Па выніках мінулага года былі вызначаны самыя лепшыя чытачы ў розных намінацыях. І бібліятэкары, каб з пераможцаў бралі прыклад, падрыхтавалі стэндавую прэзентацыю «Чытач — ты лепшы!». Самыя актыўныя ўзнагароджаныя дыпломамі і не толькі. Юным чытачам былі ўручаны падарункі-сюрпрызы. А дарослыя атрымалі падарункавыя сертыфікаты на бясплатнае карыстанне камерцыйным абанементам на працягу студзеня.

А ў дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака можна ўбачыць калекцыю паштовак розных гадоў «Падарожжа навагодняй паштоўкі» (па 10 студзеня). Экспанаты — з асабістай калекцыі супрацоўніка бібліятэкі і падораныя чытачамі. Самая старая паштоўка, прадстаўленая на выставе, надрукавана ў 1969 годзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

## ФІЛАСОФІЯ + АНГЛІЙСКАЯ МОВА

**Адзінаццацікласнікі Ліцэя БДУ Уладзіслаў Войніч і Павел Бялькевіч прадставяць Беларусь на міжнароднай алімпіядзе па філасофіі ў 2016 годзе. Яна адбудзецца ў маі ў Бельгіі.**

Пуцёўку на прэстыжныя спаборніцтвы ліцэісты заваявалі ў выніку перамогі ў алімпіядзе па філасофіі сярод школьнікаў, арганізаванай факультэтам філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Акрамя таго, яшчэ дзевяць старшакласнікаў сярэдніх навучальных устаноў былі адзначаны дыпломамі рознай вартасці.

Юных філосафаў экзаменавалі ў два туры. Першы праводзіўся завочна, а другі этап быў вочным. Яго ўдзельнікі на працягу 120 хвілін пісалі эсэ на англійскай мове на адну з чатырох прапанаваных тэм. Кожны ўдзельнік выбіраў для каментавання і наступнага філасофскага асэнсавання выказванні Арыстоцеля, Васіля Разанава, Людвіга Вітгенштэйна або кітайскага мысляра Лю Цзуньюаня. Ліцэісты БДУ Уладзіслаў Войніч і Павел Бялькевіч выбралі для сваіх работ выслоўі Людвіга Вітгенштэйна і Арыстоцеля.

Пры ацэнцы эсэ канкурсантаў улічваліся не столькі веды па філасофскіх дысцыплінах, колькі ступень разумення філасофскіх аспектаў праблемы, паслядоўнасць і лагічнасць выкладання думак, пераканаўчасць аргументаў і арыгінальнасць самой працы. У вочным туры ў БДУ прынялі ўдзел 26 навучэнцаў з 9 навучальных устаноў Мінска і Гродна.

Міжнародная алімпіяда па філасофіі сярод школьнікаў праводзіцца пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі філасофскіх таварыстваў пры падтрымцы ЮНЕСКА. Мерапрыемства скіравана на папулярызацыю філасофіі. Беларусь удзельнічае ў гэтых спаборніцтвах толькі з 2014 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## «СНЕЖНАЯ КАРАЛЕВА» ПА-БЕЛАРУСКУ

**Віцебскі Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа парадаваў дзятву прэм'ерным спектаклем «Снежная каралева». Паказы беларускамоўнай версіі адной з самых папулярных казак у свеце прайшлі з поўным аншлагам.**

Пераклад зрабіў Леанід Дранько-Майсюк, а рэжысёр-пастаноўшчык музычнай казкі — Міхась Краснабаеў. Мастак-пастаноўшчык — Святлана Макаранка, кампазітар — Арцём Краснабаеў, аўтар тэкстаў песень — Алесь Замкоўскі. Казка «Снежная каралева» неаднаразова рабілася аб'ектам увагі многіх тэатральных рэжысёраў. І не дзіва: яна вельмі падыходзіць для стварэння захапляльнага дзіцячага спектакля. У спектаклі занятыя заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова і артыстка Анжаліка Баркоўская (роля Бабулі), артысты Аляксей Анісеня і Дзмітрый Каваленка (Кай), Настасся Веранёва (Герда) і іншыя, — паведамілі ў літаратурна-драматычнай частцы тэатра.

Сёлета ў тэатра юбілей: 90 гадоў з дня стварэння. Свята запланавана на 21 лістапада. Непасрэдна да святкавання юбілею на вялікай сцэне адбудзецца прэм'ера спектакля «Каласы пад сярпом тваім» паводле аднайменнага рамана Уладзіміра Караткевіча (рэжысёр Валерый Анісенка). У пастаноўцы будзе задзейнічана ўся трупа тэатра.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Фотарэпартаж

# СІЛІЧЫ: СНЕЖНА, ЛЮДНА, ГОРАЧА







**У мінулыя выхадныя ў горналыжным цэнтры «Сілічы» адбылося адкрыццё асноўнай спускавой трасы. Нягледзячы на халоднае надвор'е, было шмат ахвотнікаў выпрабаваць першы сіліцкі снег новага сезона.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# З КАЗАЧНАЙ РЭЗІДЭНЦЫІ Ў НАРОД

**Ужо больш за 700 чалавек з Беларусі, Расіі, Латвіі пабывалі ў рэзідэнцыі полацкага Дзеда Мароза. На Каляды галоўны навагодні казачны персанаж і яго памочнікі паедуць развозіць дзятве падарункі і дарыць святочны настрой.**

— Рэзідэнцыя Дзеда Мароза на полацкай зямлі працуе другі раз. Яна адкрыта на базе аддзела турызму, краязнаўства і экскурсій раённага Цэнтра дзяцей і моладзі. Гасцей там чакаюць па 10 студзеня. Усе ахвотныя могуць у рэзідэнцыі прыняць удзел у майстар-класах па вырабе навагодніх сувеніраў, наведаць чароўныя сувенірныя крамы. Працуе навагодняя кавярня «Марозка», — паведаміў «Звяздзе» **намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Пётр ПЯТКЕВІЧ.**



Андрэй МАРЦІНКЕВІЧ (газета «Полацкі веснік»).

Дед Мароз у Полацку.

Экскурсія ў рэзідэнцыю — гэта цікавы квест. У лесе цудаў ёсць Чароўная сцежка і балота Кікімары, Паляна навагодніх сюрпрызаў. Можна ўбачыць Урочышча мядзведзіцы і шмат чаго яшчэ. Ля ёлкі арганізуецца навагодні кастынг талентаў з гульнямі, забавамі і карагодамі. Удзельнікам кастынгу гарантаваны салодкі прыз ад Дзеда Мароза. У полацкай рэзідэнцыі таксама працуе навагодні пункт пракату лыж. Добра, што снегу ў новым годзе багата.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# «СЭРЦА ЖЫВОЕ НЯСУЦЬ КАЗАХСТАНА...»

**У Выдавецкім доме «Звязда» падрыхтавана да друку кніга казахскага вучонага, пісьменніка і асветніка Немата Келімбетава «Зайздрасць».**

Немат Келімбетаў — з кагорты тых аўтараў, якія найперш цікавяць чытача ўдумлівага, здольнага асэнсоўваць рэчаіснасць, па-філасофску аглядаць розны час, розныя падзеі. Ужо вядомыя ў Беларусі яго кнігі «Не хачу губляць надзею», «Лісты да сына». Цяпер перакладзена на беларускую мову і кніга «Зайздрасць». Днямі яна выйдзе з друку. Што цікава, у новым беларускім выданні філасофскай прозы Немата Келімбетава ў якасці прадмовы, уступнага слова змешчаны вершы трох беларускіх паэтаў — Міколы Мятліцкага, Генадзя Аўласенкі, Юліі Алейчанкі. Усе творы прысвечаны Немату Келімбетаву. «Мы не бязродныя ў стэпе шырокім,/ Памяць не выстудзяць ветры зласлівыя./ Там, дзе сыходзяцца з долам аблокі, / Крочаць прародзічы — цюркі Нябесныя./ Рушаць дарогай гісторыі пыльнаю,/ Сонца над імі — крывавая рана./ Шэпчуць нам, сыне, не скаргі магільныя — / Сэрца жывое нясуць Казахстана...» (Мікола Мятліцкі).




— Мы вельмі ўдзячны беларускім калегам за такую паслядоўнасць у знаёмстве чытачоў вашай краіны з творчасцю Немата Келімбетава, — гаворыць казахская пісьменніца Райхан Мажэнкызы. — Прыемна, што прайшлі прэзентацыі яго кніг у Мінску і іншых гарадах Беларусі. Мноства рэцэнзій, водгукаў, якія з'явіліся ў друку і прысвечаны кнігам казахскага асветніка, сведчаць пра неабыякавае стаўленне да яго творчасці. А цяпер вось уразілі і вершаваныя водгукі вядомых паэтаў на знаёмства з лёсам, творчасцю Келімбетава. Прыкуты да ложка, аўтар спавядальнай кнігі «Не хачу губляць надзею» шмат для каго з'яўляецца прыкладам жыццясцвярджальнасці, ён падобны да беларускі Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі, якая вярнулася з вайны без рук і ног. Мне здаецца, што аповесць Немата Келімбетава, іншыя яго творы асабліва важна прачытаць маладым людзям, якія думаюць, разважаюць над тым, якім павінна быць жыццё, з каго гэтае жыццё рабіць.

Варта нагадаць, што ў Выдавецкага дома «Звязда» ўвогуле склаліся добрыя адносіны з казахскімі літаратарамі. Гэта відаць і па многіх творчых праектах беларускіх літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў. З іх старонак да чытача прыйшлі на беларускай мове творы сучасных пісьменнікаў Казахстана Нурлана Аразаліна, Святланы Ананьевай і іншых паэтаў і празаікаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**